

DC COMICS™
THE NEW 52!
The FLASH®
9
WHAT GRODD™ WANTS...
...HE TAKES!
2012 FJM
FRANCIS MANAPUL
BRIAN BUCCELLATO
COMICS .BY КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
Флэш
№9 (2011)
пераклад
і афармленне:
Козыраў Сяргей
RATED T TEEN
JUL 2012
DCCOMICS.COM





ЗОРНЫЯ ВОЙНЫ. ДАРТ ВЭЙДЭР

(НУМАР 1. MARVEL, 2015)


ужо даступны на www.patreon.com/comicsby

Gillen, Larroca, Delgado. Дзеянне адбываецца пасля падзей «Зорных войн: Эпізод IV: Новая надзея» і першых трох выпускаў комікса «Зорныя войны». Дарт Вэйдэр павінен пакутаваць ад наступстваў яго нездольнасці спыніць Альянс паўстанцаў падчас бітвы пры Явіне, і адпраўляецца на місію, каб весці перамовы з Джаба Хатам . Тым часам Вэйдэр наймае двух паляўнічых за галовамі, каб схапіць Люка Скайуокера і таямнічага агента Імператара.








«Страх можа быць карысным».
«Ён папярэджвае нас аб небяспецы».
SAFARI EXPERIENCE
DC COMICS
«Страх можа быць той іскрай, якая дапамагае нам вырашыць, як дзейнічаць... **змагацца** ці **бегчы**».
«Нажаль, часам ён з'уляецца занадта **позна**».
PROUDLY PRESENTS
«Можа быць яшчэ горш... Часам ён **паралізуе** нас».


THE
STORY BY FRANCIS MANAPUL & BRIAN BUCCELLATO
ART BY FRANCIS MANAPUL
ФЛЭШ: СТРАХ
IN




COLORS BRIAN BUCCELLATO • LETTERS WES ABBOTT
COVER MANAPUL WITH BUCCELLATO • VARIANT COVER TONY S. DANIEL & SANDU FLOREA WITH TOMEU MOREY
ASSISTANT EDITOR DARREN SHAN • EDITOR BRIAN CUNNINGHAM






ГОРАД ГАРЫЛ.
Я паглынуў мозг майго бацькі... Забраў яго веды... Яго памяць... Гэтага не дастаткова. Цяпер я кароль і я хачу... яшчэ больш.
Кароль Грод, азірніся!
Гэта ўварванне?
Вы... вы можаце размаўляць?!
ДЗЕ Я?
Ён прыйшоў разам з маланкай! Ён **пасланец**?
Не, генерал Сільвербэк. Я адчуваю яго страх.
Ён не пасланец. Ён дэсерт!
Дэсерт..?
Схапіць яго!



UNGGHHHHH--
WHUMP
Калі ласка, кароль Грод, мы просім вас... ён не здабыча.
Не... Ён нешта **большае**. Паглядзіце на яго сімбал... Ён ад святла.
Ён пасланец!
Я адчуваю энергію святла, што бушуе ўнутры цябе, чалавек.
Святла?
Якое ў цябе **пасланне** для мяне?
Кажы! Хто ты, чалавек?!
Я... Я...
...ня ведаю.


УНУТРЫ СПІДФОРСА...
Божа-о-божа-божа... Я не патрапію на іспыты... Я **ведаю**, што не патрапію на свае іспыты...
Гэй, ледзі! Вы проста марнуеце час, гуляючыся з гэтай штуковіна. Флэш ужо даўно знік.
Сур'ёзна, Гомез? У яе ёсць імя.
Прывітанне. Я... Марыса.
Айрыс Уэст. А Флэш ні за што бы нас тут не заставіў. Калі б ведаў.
Мы нават ня ведаем, дзе гэта «тут».
Айрыс... Рэпарцёрка, так?
Так.
Я Альберт. Можна мне паглядзець на гэтую штуковіну? Я спецыялізуюся на тэхніке... Ва ўсялякім выпадку, так **было** раней... Зараз, верагодна, я ўжо ўсё заваліў.
Як доўга мы тут знаходзімся? Я павінен ужо **захацець есці**, але ляшчэ не галодны.
Напэўна, гэта з-за месца. Ніхто з нас ні еў і не піў на працягу некалькіх дзён.
Магчыма, мы ўжо памёрлі і нават ня ведаем аб гэтым. Як у тым старым тб-шоў, дзе ўсе згубіліся...
«Лост», так?
Я ня ведаю. Я мала гляджу ТБ...
GRRRRRRRRRRRRRR
GRROOWWLL
Што... Што гэта?
Нічога прыемнага...


«...Зусім нічога прыемнага...
ПАЛІЦЫЯ ЦЭНТРАЛ СІЦІ.
Хартлі, ужо прыкра тое, што ты паказваешся на маёй працы... Але звешваць на мяне **гэта**?
Ты чагосьці **баішся**?
CENTRAL CITY POLICE
Ты напэўна жартуеш, так? Яны ўжо праводзяць публічныя дэманстрацыі, пратэстуючы супраць аднаго мсціўца. А цяпер **ты** хочаш вярнуцца і пабавіцца ў героя?
Я хачу гэта зрабіць менавіта **з-за** дэманстрацый. І гэта не забава. Пакуль Флэша няма, я **патрэбен** Цэнтрал Сіці. Яму патрэбен **Пайд Пайпер**.
Гэтаму гораду **не** патрэбен яшчэ адзін мсцівец. І ня трэба паказвацца там, дзе людзі могуць нас убачыць разам.
Дык вось у чым справа. Ты баішся, што людзі пачнуць **пляткарыць**.
Стоп.
Гэта **ня** так. Ня добра будзе выглядаць, калі агульнавядомы **мсцівец** з'явіцца...
Не пераводзь зноў размову на тэму Пайда Пайпера. Справа ў **нас**. Табе і мне.
Калі ты сам не можаш прызнаць нашыя стасункі, як **астатнія** змогуць?
NOK NOK
Прабачце, што ўмешваюся, дырэктар... Гэта проста... Я проста спадзявалася, што вы зможаце падпісаць **заяву на адпачынак.**
Эм... Я зайшла не ў той час?
Не... Не... Усё, што табе трэба, Пэці. Ухм... Проста пакінь яе тут, і я падпішу.
Добра, Дэвід... Барані свае **сакрэты**...



«...Але ведай, што гэта не выйсце».
ГОРЫ ВІРУНГА, УСХОДНЯЯ АФРЫКА.
На працягу многіх пакаленняў мы выкарыстоўвалі наш ментальны дарунак для таго, каб захоўваць наша існаванне ў сакрэце.
Час адмовіцца ад ментальнай праекцыі, якая **хавала** наш горад.
Мы ня можам больш трымаць горад гарыл у сакрэце. Грод нам гэтага не **дазволіць**.
Так, старэйшына, сіла святла прадказала нашу будучыню, і мы ведаем, што Грод раскрые наша існаванне ўсяму свету. Але чаму зараз?
Бо з'явіўся **пасланец**, што азначае **канец нашага часу**.
Гэта ахвяра, на якую мы павінны пайсці. З'яўленне гэтага чалавека і ёсць пасланне, якое азначае, што наш час скончаны. Каб гэты свет мог выжыць, мы павінны дазволіць нашай цывілізацыі загінуць...
Гэта тлумачыць, чаму наша сувязь са святлом пачала **гаснуць**...
Пасланец павінен прынесці святло ў свет, а мы павінны яго **вызваліць**, каб ён выканаў сваё **прызначэнне**.
Нават... калі гэта азначае нашу смерць?
Мы пачалі паміраць ужо **даўно**. Наш парыў са святлом прывёў да з'яўлення новага пакалення, больш **жорсткага**, больш... палага. Гэта не наш шлях. Мы павінны ўсё зрабіць **правільна**.
Тады вырашана. Мы павінны вызваліць пасланца перш, чым кароль Грод знішчыць яго і прынясе разбурэнне ў свет.


Гэта ўсё не мае сэнсу.
Я ня ведаю, хто я ці чаму я тут. Я нават ня ведаю, што за «Святло».
Прабачце... Але калі я «пасланец», тады чаму я прыкаваны да гэтай калоны?
Гэта не калона. Гэта громаадвод. Маяк святла, які прывёў цябе да нас.
Гэта наш сімбал надзеі і сілы. З яго дапамогай мы можам падлучацца да святла. Як ты можаш гэтага ня ведаць?
Я нічога ня ведаю. Мой розум цалкам чысты.
=цц=
Кароль Грод меў рацыю. Ён не пасланец.
Калі я не пасланец, тады хто я?
THUKK
Дазволь нам паказаць...
THUKK



Куды мы ідзем?
У пячорах пад нашым горадам ёсць адказы, якія ты шукаеш.
Там знаходзяцца старажытныя малюнкі, якія адлюстроўваюць наша разуменне маланкі, гісторыю нашага віду і наша бачанне будучыні.
Калі яны тут з'явіліся?
У працэсе яно спусцілася і знішчыла старажытную цывілізацыю...
А потым прыбыў ты, выбраны... Адзін годны дарунка і цяжара святла.
Бачыш, ты быў пасланы сюды ня проста так, а для таго, каб **мы** маглі перадаць **табе** пасланне.


У самым пачатку нашага існавання. Калі нашых продкаў ляснула маланкай, гэта паскорыла іх **развіццё**. Гэта дазволіла ім бачыць **мінулае, цяперашняе і будучае**.
Але з кожным новым пакаленнем мы па крыху гублялі сувязь са святлом.
Вы, сапраўды, верыце ва ўсё гэта?
Магутнацсь святла - гэта **факт**, **не** сімбал веры. Святло - гэта прастора і час. Гэта тое, што дазваляе нам рухацца **наперад**. На працягу многіх пакаленняў мы імкнуліся далучыцца да святла, пабудаваўшы ўвесь горад у выглядзе громаадвода.
Мы цярпліва чакалі... толькі для таго, каб зразумець, што мы не можам гэтага зрабіць. Што нам гэта не лёсавана. З часам святло ад нас адмовіцца і паспрабуе знайсці **адзінага** годнага яго магутнасці.
Яно кранулася групы прыматаў, і нарадзілася **наша** цывілізацыя...
Яно выкрала лётчыка і зрабіла яго палоннікам святла.
Ты бягун. Святло рухае гэты свет наперад, і кожным сваім крокам ты ахоўваеш гэты свет. Твой лёс - **бегці за нас усіх**.
Тады... Чаму я ня памятаю нічога з гэтага?


Бо гэта ўсё хлусня!
Ты ня ведаеш, хто ты, бо гэта ня важна! Ты пасланы сюды як **дарунак** мне!
Я не дазволю **маім малпам** загінуць, як гэтым майя... Я з'ем твой мозг і забяру ўсе сілы святла!
WHUMPP



Твой **страх** **адчувальны**, пасланец... Я **чую**, як ім смярдзіць ад цябе.
І з гэтай сілай я не толькі выратую маіх малпаў...
...але і вывяду маю імперыю з ценю і **захаплю ўвесь свет**.
І ён пахне **цудоўна**.



«...Мы ўсе чагосьці баімся, Бары».
«Ёсць рэчы, якія нас пужаюць настолькі, што мы адчуваем сябе **баязліўцамі**».
«Але баяцца гэта нармальна. Гэта больш чым нармальна... Гэта неабходна».
«Не бывае **адвагі** без страха».
«Запомні, Бары, баяцца гэта нармальна. Да тога моманту, пакуль гэта не спыніць цябе».
Я ведаю, хто я. **Я Бары Ален**.
І я –
The FLASH


KRUNCH
І я - самы хуткі чалавек у свеце!
Ты не можаш убегчы ад **страху**!
Менавіта таму я бягу **насустрач** яму, Грод.
Адзіны спосаб перамагчы страх - гэта сустрыцца з ім **сам на сам**.
Вось чаму ў цябе такі запал, чалавек?!
WHAP
WHAP
WHAP
WHAP
THOOM
Ты нават не ўяўляеш сабе, які.
ГРРРРРРООООВВВВВРРРР!


?
RUMMMMMMM
THOK
Ты не можам мне **нашкодзіць**, чалавек!
Магчыма, так і ёсць.
Я не спынюся, пакуль не з'ем твой мозг і не атрымаю твае сілы, каб прывесці маіх малпаў да сусветнага панавання!
Я не дазволю табе гэтага, Грод! Твая прагнасць **знішчыць** гэтае месца і твой народ!
Хлусня!
Пачакай, Грод... Гэта дрэнная ідэя...
Мой кароль... **Не**! Вы жа...


...абрынеце ўсю пячору!
KRAKK
Не...
Бяжыце! Пячоры... Яны бурацца!


«Жыхары Горада Гарыл, вы заўсёды даверала мудрасці сваіх старэйшын...»
ПАЗНЕЙ.
...Я прашу вас і ў гэты неспакойны час зноў нам паверыць. На працягу тысячагоддзяў мы спадзяваліся на тое, што святло пакажа нам шлях, а наш кароль павядзе нас туды.
Надыйшоў час стварыць наш уласны шлях. Кожны з нас мае права распараджацца сваім лёсам. Так сама, як і гэты чалавек мае права кіраваць сваім.
Я прашу вас усіх... Дазвольце яму спакойна дабрацца да дому. Кароль Грод прымусіў нас паверыць, што смерць гэтага чалавека прывядзе да нашага панавання... Але ён не прадбачыў, што гэта прынясе толькі разбурэнне ў свет.
Што наконт караля Грода?
Ён заб'е нас за здраду!
Так і будзе... Але з ім мы разбярэмся, калі ён вярнецца да прытомнасці.
Лёс гэтага чалавека злучаны з лёсам усяго свету. Наш быў у тым, каб даць яму мэту.
Прыйшоў час вярнуцца табе да дому, **Бягун**. Свет чакае цябе.
Пачакай...
А як жа мы?
Вы ўсе вольныя. Вам вырашаць.
Аднавіце свой горад і знайдзіце свой шлях. Ваш лёс больш не звязаны з Гродам.
Ці мной.


ПАЎДНЁВАЯ АМЕРЫКА, БОРТ 661. РЭЙС З ЦЭНТРАЛ СІЦІ Ў ГВАТЭМАЛУ.
Я ўсё яшчэ не магу паверыць, што Сінг падпісаў маю заяву на адпачынак. Ён, напэўна, стаміўся хадзіць вакол мяне на цыпачках.
Ці, можа, ён баіцца, што я далучуся да адной з гэтых вар'яцкіх дэманстрацый...
...Сур'ёзна, калі гэта хлопчык **абслініць** мяне...
Пэці, напраўда..? Ты, сапраўды гатова праляцець такую адлегласць, каб раскрыць забойства? І ахвяра цябе нават не блізкі чалавек, ды і наогул ніхто?
Не.
Ваў. Доўгі шлях, каб раскрыць справу.
Мой тата заўсёды казаў, што дабро і зло не маюць юрысдыкцыі.
І часам табе трэба проста ўехаць, каб **глытнуць свежага паветра**.
Выдатна, ці не праўда, Марка? Стаяць на вяршыні імперыі. Як мы заўсёды і марылі.
Як ты і мой брат заўсёды марылі.
Клаўдзіа ганарыўся бы. А калі мы скончым, кожны картэль адсюль і да Злучаных Штатаў **абрынецца** перад **сям'ёю Мордан**.
Нават надвор'е падпарадкуецца нам...


ЦЭНТРАЛ СІЦІ.
Прыемна быць **дома**.
Як быццам бы я тут не быў цэлае стагоддзе.
Горад вярнуўся ў норму. Выглядае нават лепш, чым было.
HOT DOG
SAUSAG
FRIES
SODA
Эліас, напэўна, выкарыстаў з карысцю назапашаную энэргію за той месяц, пакуль мяне не было.
Мне трэба прыдумаць, як усім расказаць, што я вярнуўся. Не ўпэўнены...
...Я дзесьці патрэбны?
Доктар Эліас..?
Усё аднолькавыя перад законам!
Нам не патрэбны так званыя супергероі ці мсціўцы, якія падвяргаюць нашыя **жыцці**... наш горад... небяспецы! Таму **падтрымліваю** цяжкую працу і адказнасць...
...Будзь ты пракляты, Флэш!
STOP
WE NEED REAL HEROES!
ELIAS IS OUR HERO
NEXT:
WEATHER WIZARD!


DC COMICS
THE NEW 52!
The FLASH
9
ESCAPE FROM
GORILLA CITY!
FRANCIS
MANAPUL
BRIAN
BUCCELLATO
RATED T TEEN
JUL 2012
DCCOMICS.COM

ПАДТРЫМАЙ МЯНЕ НА PATREON

www.patreon.com/comicsby

Твая падтрымка дапаможа мне праводзіць больш часу за перакладамі коміксаў, каб у цябе было яшчэ больш літаратуры на беларускай мове.

Выбяры адзін з варыянтаў падтрымкі на patreon:

Афіцыйны патрон

3 $
ЗА МЕСЯЦ

ДАЛУЧЫЦЦА

Афіцыйны патрон атрымлівае спасылку на рэліз перакладa **на 1 месяц раней**, чым падпішчыкі ў сацыяльных сетках.

- На 1 месяц раней, чым усе

Патрон з падпіскай прэміўм

5 $
ЗА МЕСЯЦ

ДАЛУЧЫЦЦА

Патрон з падпіскай прэміўм атрымлівае спасылку на рэліз новых серый **на 1 год раней**, чым падпішчыкі сацыяльных сетак.

Сярод такіх новых серый мы плануем коміксы «Цуда-жанчына», «Дарт Вэйдэр», «Чорны молат», «Дэпартамент праўды» і інш. Спачатку - па 2 выпускі ў месяц, а далей - у залежнасці ад колькасці патронаў з падпіскай прэміўм.

Так сама атрымлівае ўсё тое, што і **Афіцыйныя патроны**.

- На 1 год раней, чым усе
- На 1 месяц раней, чым усе
- Дотык да новых серый коміксаў

Мае мэты:

100 патронаў -
я найму перакладчыкаў, каб было яшчэ больш перакладаў на беларускую мову.

500 патронаў -
я ствару выдавецтва, мэтай якога будзе - электронная публікацыя арыгінальных коміксаў і кніжак на беларускай мове.

1000 патронаў -
выдавецтва пачне друкаваць папяровыя кніжкі і коміксы з творамі на беларускай мове, якія можна будзе набыць у беларускіх крамах.